# ДОБРАЯ СПРАВА З'ЯДНОЎВАЕ

**У краіне працягваецца экалагічная кампанія "Добраўпарадкуем малую радзіму!". Сёлета яна прысвечана 75Fгоддзю Вялікай Перамогі.**

— Мы заклікаем усіх жыхароў нашай краіны, грамадскія аб'яднанні і арганізацыі актыўна ўключыцца на працягу года ў экалагічную кампанію, — сказала начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна Кананчук. — Кожны можа зрабіць свой унёсак у паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя і захаванне памяці пра гераічную перамогу нашых продкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны!

Штогод да кампаніі далучаюцца не толькі прадстаўнікі дзяржорганаў, але і неабыякавыя грамадзяне. Дзякуючы сумеснай працы ў мінулым годзе былі высаджаны больш за 500 тыс. дрэў, створаны 52 тыс. га новых лясоў. У рамках акцыі "Чысты вадаём" прыведзены ў парадак 1,2 тыс. км берагавой лініі вадаёмаў і вадацёкаў. Добраўпарадкаваны 2883 прыдамавыя тэрыторыі, 7665 мемарыяльных комплексаў, месцаў баявой і воінскай славы і іншых памятных месцаў, валанцёрамі абследаваны 625 крыніц.

— Мы вельмі ўдзячныя ўсім тым, хто ўзяў удзел у мерапрыемствах, агучаных ці запланаваных у рамках рэспубліканскага плану па навядзенні парадку на зямлі, — адзначыла Таццяна Кананчук. — Пры гэтым ёсць шмат ініцыятыў, якія ішлі менавіта ад валанцёраў, напрыклад, "Зробім!" ці "Моладзь за чысціню гарадоў і сёлаў". І сёлета хацелася б, каб мы таксама актыўна ўключыліся ў справу добраўпарадкавання нашай Радзімы, захавання яе прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. Мінпрыроды вітае і будзе падтрымліваць ініцыятывы ад грамадзян і грамадскіх аб'яднанняў.

На 2020 год запланаваныя ўжо традыцыйныя мерапрыемствы і экалагічныя акцыі: вясной і восенню — азеляненне свайго рэгіёну, двара, вуліцы; у маі-чэрвені можна заняцца добраўпарадкаваннем крыніц, экалагічных сцежак, а ў верасні — далучыцца да велапрабегаў у рамках Дня без аўтамабіля, якія будуць арганізаваныя ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі. Для гэтага дастаткова звязацца з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды і атрымаць інфармацыю, дзе ў населеным пункце ці рэгіёне плануюцца адпаведныя мерапрыемствы і якія аб'екты патрабуюць добраўпарадкавання.

Як расказаў начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалай Свідзінскі, мерапрыемствы па азеляненні населеных пунктаў, праведзеныя ў мінулым годзе, дазволілі павялічыць плошчу зялёных тэрыторый у гарадах і райцэнтрах на 2592,3 га, а ўзровень азелянення дасягнуў неабходнага паказчыку (40 % ад агульнай тэрыторыі) у 88 населеных пунктах, ці 72 % ад іх агульнай колькасці. Пры гэтым у многіх з іх, дзякуючы ўдзелу грамадскасці, намечаныя планы былі перавыкананы. Гэтага ж чакаюць і сёлета — усяго ў краіне плануецца пасадзіць 217 тыс. дрэў і кустоў.

У рамках кампаніі тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды сумесна з зацікаўленымі службамі праз інтэрнэт-сайты і СМІ арганізавалі збор прапаноў ад насельніцтва аб пажаданых месцах пасадкі драўнінна-хмызняковай расліннасці на землях агульнага карыстання. Усе гэтыя прапановы прааналізуюць і падбяруць адпаведныя ўчасткі, прыдатныя для азелянення.

**Вераніка КОЛАСАВА**

**Источник:** Родная прырода. – 2020. – № 4. – С. 5.